документов и проведении ремонтных работ, а также положительно повлияет на желание потенциальных покупателей в приобретении подобных объектов.

**5. Повышение информированности о законодательных требованиях.** Широкое информирование собственников о реализации обязательных процедур (например, о заключении охранных обязательств, разработке паспортов и проектов зон охраны, установке охранных досок и др.) посредством официальных ресурсов (газеты, мессенджеры, телевидение и др.).

Таким образом, внедрение комплексного подхода, сочетающего образование, контроль, информирование, финансовую поддержку и оказание консультативной помощи, позволит снизить риск проведения незаконных ремонтных работ, повысит осведомленность собственников о законодательстве, а также может положительно повлиять на покупателей, которые имели сомнения в приобретении объектов историко-культурного наследия.

Охрана историко-культурного наследия в Беларуси – это важная комплексная задача, включающая учёт, реставрацию и сохранение уникальных объектов и нематериальных ценностей, имеющих мировое, международное, национальное и региональное значение. Формирование Государственного списка историко-культурных ценностей способствует систематизации и государственной защите данных объектов. Несмотря на значительный прогресс и активную работу государственных структур по сохранению, расширению списка и популяризации наследия, многие памятники были утрачены или повреждены в XX веке вследствие исторических событий, которые происходили на территории Беларуси. В связи с этим детальное внимание к вопросам охраны наследия со стороны государственных органов укрепляет статус приоритетного направления, необходимого для обеспечения сохранения исторической памяти и формирования культурной идентичности государства.


1. BELARUS.BY : [сайт]. – URL: https://www.belarus.by/ru/travel/heritage (дата обращения: 10.09.2025).
2. Museum.by – "Музеи Беларуси" : [сайт]. – URL: https://cinema.museum.by/ (дата обращения: 12.09.2025).
3. БЕЛТА : [сайт]. – URL: https://belta.by/culture/view/belorusskuju-dudu-planirujut-vkljuchit-v-spisok-objektov-nematerialnogo-kulturnogo-nasledija-junesko-714875-2025/ (дата обращения: 10.09.2025).
4. Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь. – URL: https://cinema.museum.by/ (дата обращения: 16.09.2025).
5. Информационный сайт Слуцка Slutsk-Gorod.by : [сайт]. – URL: http://slutsk-gorod.by/novosti/item/zdanie-konservnogo-zavoda-v-slutske-vystavili-na-auktsion-za-bazovuyu (дата обращения: 20.09.2025).
6. Национальный центр законодательства и правовой информации Республики Беларусь : [сайт]. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413 (дата обращения: 10.09.2025).
7. Пресс-служба Президента Республики Беларусь. – URL: https://president.gov.by/ru/belarus/social/culture/istoriko-kulturnoe-nasledie (дата обращения: 10.09.2025).



**Асмалоўскі М.П.**


## "СТРАЛА". ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНАГА АБРАДА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ


*Ключавыя словы:* "Ваджэнне і пахаванне Стралы", нематэрыяльная гісторыка-культурная спадчына, традыцыйны абрад, рэпрэзентацыя традыцыйнага абрада, праблемы захавання традыцыйнага абрада.


"Ваджэнне і пахаванне Стралы" належыць да абрадаў веснавой часткі каляндарна-земляробчага цыкла. Першыя фіксацыі вядомыя ўжо з першай паловы XIX ст. [1, с. 130]. Па форме "Страла" ўяўляе рытуалізаванае шэсце-абыход і суправаджаецца спецыфічным песенным рэпертуарам, карагодамі ў кульмінацыйных момантах абрада, тэатралізаванымі рытуальнымі дзеяннямі прадукуючага характара.

Элементы "Стралы", прынамсі яе багаты песенны рэпертуар, маюць шырокі арэал бытавання і ў пазнейшы час адрываюцца ад абрада, пераходзячы ў іншыя песенныя

жанры. Як традыцыйная цырымонія да канца XX ст. комплекс найбольш поўна захоўваўся на гомельска-бранска-чарнігаўскім памежжы [1, с. 140].

Натуральны асяродак "Стралы" – сялянская грамада з яе аграрнай акцэнтаванасцю і народна-хрысціянскім светапоглядам. Гэтым абумоўлены асаблівасці бытавання абрада: храналагічная прымеркаванасць (веснавы цыкл); рытуальная прымеркаванасць (Благавешчанне, Вялікдзень, Ушэсце); агульнасць (прысутнічае ўвесь калектыў населенага пункта); прадметная атрыбутыка сімпатычнага характара (лялька, іголкі, капейкі, галінкі, кара́лі і да т. п.); казуальнасць (падчас прыродных анамалій можа выконвацца "не ў пару́"); выразная фазавасць ((служба)-шэсце-карагод-шэсце-карагод-гульні))[1].

Мэта абрада вызначае яго бытаванне, форму і ўмовы. "Страла" мае выразную шматмэтавасць, якая можа быць зведзена да трох магістральных функцый: апатрапейная; прадукуючая; камунікатыўная.

На апатрапейную і прадукуючую функцыі паказваюць адказы, атрыманыя ад носьбітаў традыцыі на пытанне аб прычыне ваджэння "Стралы": "штоб (усё) урадзіла", "штоб жыта ўрадзіла", "штоб лён рос", "штоб ураджай сена быў", "штоб пажару не было", "штоб гром дамы ня біў", "еслі дажджу німа", "штоб дожч ні мясіў, бываюць жа заліўныя дажджы" [3, с. 236].

Камунікатыўная функцыя рэалізуецца праз агульны ўдзел усіх гендэрна-дэмаграфічных страт населенага пункта. Пры гэтым важна разумець спецыфіку, паводле якой ярка вылучаюцца а́ктары абрада – у пераважнай большасці зафіксаваных выпадкаў жанчыны і дзеці, – і яго ўдзельнікі – усе прысутныя незалежна ад ролі ў абрадавай частцы. У святочнай частцы, рэалізаванай праз гулянне, грамада зноў злучалася.

Абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы" уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 33АК000003 паводле рашэння Рады ад 15.11.2006 № 125 і пастановы Савета Міністраў ад 14.05.2007 № 578. Пазіцыя была зменена на падставе рашэння Рады ад 10.10.2022 № 04-01-02/8 і пастановы Міністэрства культуры ад 28.10.2022 № 83 [4, с. 36].

Гэта абумоўлена адсутнасцю ў Казацкіх Балсунах носьбітаў традыцыі, здольных стала яе здзяйсняць. Грамадская супольнасць, ў якой функцыянуе абрад, цягам XX – пачатку XXI стст. разбураецца або трансфармуецца. На цяперашні момант можна гаварыць хутчэй пра рэпрэзентацыю рытуальнай дзеі. Такая інтэрпрэтацыя ставіць шэраг пытанняў да методыкі далейшага захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Ніжэй на прыкладзе абрада "Страла" вылучаны асноўныя праблемы, якія могуць пагражаць яе далейшаму бытаванню або існаванню: адсутнасць унутранага рэгулятара; наяўнасць невядомых удзельнікам этычных правіл якія прама не вынікаюць з хода абрада; шырокая варыятыўнасць абрада; звядзенне да інварыянта; успрыняцце традыцыйнага абрада як культурна-масавага мерапрыемства сучаснага тыпу.

Кожная з пералічаных праблем негатыўна ўплывае на існаванне ўсяго абрада. У залежнасці ад канкрэтных умоў, інтэнсіўнасць уплыву розніцца. Відавочна, такі ўплыў праз абектыўныя прычыны адчувае не толькі комплекс "Стралы". Таму выпрацоўка спосабаў нейтралізацыі азначаных вышэй праблем падаецца важнейшай задачай пры захаванні усяго корпуса НГКС.

---

[1] Этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ВМСБТ ў рэгіёне Пасожжа-Падняпроўе, дазваляюць сцвярджаць, што абраду папярэднічала царкоўная служба або малебен. Ускосна гэта пацвярджае храналогія "ваджэння": нідзе не фіксуецца пачатак, больш ранні за поўдзень. У населеных пунктах, дзе бытавалі "Свечы", сінхронныя абраду, перанос "Свячы" правілі да "Стралы". У населеных пунктах, дзе адсутнічала і царква, і "Свяча", малебенную частку здзяйснялі самі жыхары да пачатка "ваджэння" [2, с. 46].

Адсутнасць унутранага рэгулятара можна разглядаць у якасці найбольш істотнай небяспекі для захавання абрада. Традыцыйна заўжды існаваў чалавек (або група людзей), які валодае пераканаўчым аўтарытэтам і чыя кампетэнтнасць у сферы правядзення абрада не аспрэчвалася.

Калі размова пра Стрэльны комплекс, гэта жанчыны сталага веку, якія добра ведалі ход абрада, песенны рэпертуар, валодалі высокім выканальніцкім талентам. Іх уплыў на грамаду дазваляў лакалізаваць або прадухіліць магчымыя хібы падчас рытуальнай і/або святочнай часткі дзеі.

Там, дзе такі унутраны рэгулятар існуе, абрад працягвае бытаваць нават пры мінімальнай колькасці ўдзельнікаў. Прыкладам можа служыць в. Бабічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці. Там, дзе рэгулятар з пэўных прычын адсутнічае, абрад як агульная з'ява можа спыніцца нават пры дастатковай колькасці дасведчаных удзельнікаў, як гэта адбылося ў аг. Неглюбка Веткаўскага раёна ад 2015 г.

Універсальны спосаб вырашэння у наш час падаецца немагчымым. Завадатар мусіць спалучаць адразу шэраг кампетэнцый: дасканалае веданне лакальнага варыянта абрада, яго рэпертуара, мець мастацка-выканальніцкія здольнасці, арганізацыйныя здольнасці. Прызначэнне адказных за абрад па лініі ўстаноў культуры можа справакаваць фармалізацыю працэсу або поўнае яго скажэнне, напрыклад, праз неразуменне стылістычных нюансаў. Аасабістая зацікаўленасць дасведчаных мясцовых жыхароў і праз гэта натуральнае дэлегаванне "абавязку" вядоўцы абрада можа станоўчым чынам уплываць на захаванне ўсяго абрада, але не гарантуе яго.

Нават наяўнасць дасведчанага рэгулятара не заўжды абазначае захаванне цэласнасці дзеі. Звычайна мясцовыя жыхары ведалі ход абрада, уласцівую яму унутраную логіку, сістэму рытуальных дазволаў і забарон. У цяперашні час значная колькасць прысутных не валодае гэтымі ведамі, або валодае недастаткова ці свядома іх ігнаруе. Як прыклад можна разглядаць "Пахаванне Стралы" ў аг. Стаўбун. Колькасць удзельнікаў там застаецца вялікай за кошт тых, хто мэтанакіравана прыязджае з іншых мясцовасцяў. Намі неаднаразова фіксаваліся ўчынкі, адназначна табуяваныя ў традыцыйнай "Страле": разрыванне фатографамі і відэааператарамі карагодных ланцугоў і колаў і да т. п. Носьбіты традыцыі не заўжды могуць прадухіляць такія выпадкі, што нішчыць рытуальны сэнс абрада.

Момант захавання рытуальнай этыкі можна разглядаць як агульнае вузкае месца любога абрада. Пытанне аб тым, як у сучасных умовах прадухіліць дзеянні, неэтычныя з пункту гледжання традыцыі, патрабуе дадатковага глыбокага абмеркавання.

"Страла" належыць да абрадавых комплексаў з шырокім арэалам бытавання. Ва ўмовах закрытых аграрных соцыумаў гэта спрыяла з'яўленню варыянтаў адной і той жа рытуальнай дзеі. Пры захаванні агульнай унутранай логікі і сэнса, якія дазваляюць прыяднаць той ці іншы варыянт да "Стрэльнага" комплекса, шматлікія варыянты "Стралы" адрозніваюцца мастацка-стылістычнымі нюансамі, якія рэалізуюць дадатковыя рытуальныя сэнсы, актуальныя ў той ці іншай мясцовасці. Сюды можна аднесці "Ваджэнне Старцаў" з неглюбскага варыянта, гушканне дзяцей пасля "Крывога танка" з казацка-балсунскага варыянта і да т.п.

Яшчэ большая разнастайнасць уласціва для песеннага рэпертуара "Стралы". Ад вёскі да вёскі добра прасочваецца варыятыўнасць тэкстаў, якія спяваюцца на аднолькавы матыў [1, с. 135]. Такая варыятыўнасць можа рэалізоўвацца сінтагматычным, тэкстуальным, меладычным узроўні. Напрыклад:

"…Ты юбі, Страла, добрага молайца…" – "… Ты ня ўбі, Страла, добрага молайца…";

"Ты ідзі, Страла, да юдоль сяла" – "Мы на сена йдом, мы на новае";

працягнуты тон на словаабрыве з рэдукаваным гуканнем – выразнае гуканне з працягнутым заканчэннем музычнай страфы.

Неаднастайны і сам корпус тэкстаў, які суправаджае розныя этапы дзеі. Для носьбітаў традыцыі гэтыя асаблівасці застаюцца натуральным спосабам адрозніць свой варыянт цырымоніі ад іншых. Звычайна гэта суправаджаецца добрым веданнем іншай традыцыі ў тым, што датычна аспектаў адрознага. Падчас экспедыцыйных запісаў дастаткова часта гучала сцвярджэнне тыпу: “у нас так не рабілі. Так рабілі (указанне населенага пункта)”. Такая антанімія дазваляла, сярод іншага, умацоўваць свой варыянт як адзіны “правільны”.

Ва ўмовах, калі ўдзельнік абрада не належыць да мясцовай супольнасці, гэтыя акалічнасці могуць не ўсведамляцца, або інтэрпрэтавацца як няважныя. У перспектыве гэта вядзе да хімерызацыі рытуальнай дзеі, калі яна часткова або цалкам спалучае ў сабе некалькі субэлементаў розных лакальных традыцый, не адпавядаючы ні адной з іх. У такіх выпадках гаварыць пра рэпрэзентацыю традыцыйнага абрада не прыходзіцца.

Магчымы сітуацыі, калі з шэрага лакальных традыцый вылучаецца адна, і ўжо яна пазіцыянуецца як адзіная верная. Звядзенне шэрага варыянтаў да інварыянта збядняе традыцыю, хаця, на фармальным узроўні, спрыяе захаванню і папулярызацыі абранага інварыянта.

Апісаныя вышэй праблемы не адносяцца да крытычных на кароткіх адлегласцях часу. Яны выпраўляюцца навукова-даследчай і папулярызатарскай работай. Да таго ж людзі, якія бяруць удзел у “Страле” з года ў год натуральным чынам пераймаюць асаблівасці яе правядзення непасрэдна ад носьбітаў у працэсе.

Яшчэ адным выклікам рэпрэзентацыі традыцыйнага абрада з’яўляецца яго ўспрыняцце як культурна-масавага мерапрыемства сучаснага тыпа. За савецкім часам сфарміравалася і замацавалася ўяўленне, згодна якому прысутныя падзяляюцца на камунікатараў і рэцыпіентаў. Гэты падзел выразна праходзіць па лініі “выканаўца абрада – прысутны”. Такім чынам грамада, якая ў традыцыйным абрадзе выконвала ролю калектыўнага сведкі, ператвараецца ў сукупнасць гледачоў, штучна адмежаваных ад абрада.

Ва ўмовах, калі дзяржава прымае адказнасць за захаванне элементаў ГКС, адказнасць за іх правядзенне ўскладаецца на прадстаўнікоў мясцовых аддзелаў культуры. Культурна-масавае мерапрыемства сучаснага тыпу мае шэраг адметнасцяў. Бадай галоўная з іх – патрабаванне відовішчнасці. Між тым, традыцыйны абрад не абавязкова мусіць быць відовішчным. Работнікам культуры варта пазбягаць выпадкаў нематываванага падвышэння мастацкіх якасцяў рытуальнай дзеі за кошт гіпертрафіраванага акцэнтавання наяўных мастацкіх элементаў або ўвядзення для яе неўласцівых.

Традыцыйная абраднасць з’яўляецца выдатным сродкам перадачы культурнай спадчыны ва ўмовах рэпрэзентацыі ў сучасным грамадстве. Азначаная рэпрэзентацыя мае шэраг праблем і выклікаў. Кожная з праблем пры належнай рабоце можа быць вырашана. У сваю чаргу гэта забяспечыць перадачу аб’ектаў НГКС нашчадкам.

1. Гусев, В. Е. «Стрела» в русско-белорусско-украинском пограничье (к проблеме изучения локальных песенных традиций) / В. Е. Гусев, Ю. И. Марченко // Русский фольклор: Этнографические истоки фольклорных явлений. Л., 1987. Т. 24. – С. 128–147.

2. Архіў экспедыцыйных матэрыялаў ДУК “Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый ім. Ф. Р. Шклярава” (ВМСБТ) – Ф. 57. Арк. 46.

3. Голоса ушедших деревень / Г. Г. Нечаева, Г. И. Лопатин, С. И. Леонтьева, А. И. Дробушевский ; под общ. ред. Г. Г. Нечаевой. – Минск : Белорусская наука, 2008. – 342 с.

4. Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях : пастанова Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь ад 28 кастрычніка 2022 г. № 83. – URL: https://kultura.by/uploads/files/%D0%9F%D0%B0%D1%81%D1%82%D0%B0%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%B0%20%D0%9C%D0%9A%2028.10.2022%20%E2%84%9683.pdf (дата звароту: 23.09.2025).